# ПАМЯТКА
# “ПАДРЫХТОЎКА ДА ЭКЗАМЕНАЎ
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ
# НА II СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ”

*Экзамен дае магчымасць зразумець і ацаніць сябе, а гэта заўсёды цікава.*

АГУЛЬНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Успрымайце экзамен як жыццёвы рубеж.

Рыхтуючыся да экзаменаў, улічвайце біялагічныя рытмы: лепшы час для заняткаў - з 9.00 да 13.00 і з 16.30 да 19.30.

Кожны дзень знаходзьце магчымасць 1 — 1,5 часы знаходзіцца на свежым паветры, прысвяціўшы гэты час фізічным практыкаванням.

Прытрымлівайцеся рэжыму дня. Сон павінен быць не менш за 8 гадзін.

Звярніце ўвагу на харчаванне. Трэба есці больш рыбы, сыру, малочных продуктаў, соевых прадуктаў, яблыкаў, морквы, сокаў, тварагу, салатаў. Ежа не павінна быць цяжкай.

Пры вывучэнні і паўтарэнні матэрыялу памятайце правіла «сціранне слядоў». Запамінанне матэрыялу - гэта пакіданне «слядоў» у памяці. Пры вывучэнні падобнага матэрыялу «сляды» накладваюцца і сціраюцца. Чаргуйце гуманітарныя і дакладныя навукі.

Вывучаны матэрыял неабходна паўтарыць праз 20 хвілін. Калі гэта зрабіць, тады запамінаецца 70% інфармацыі, у адваротным выпадку — толькі 30%.

Выкарыстоўвайце як мага больш каналаў успрымання інфармацыі: прагаворвайце ўслых, малюйце схемы, піктаграмы, памячайце апорныя словы.

Любы экзамен, няхай гэта будзе выпускны або ўступны, уяўляе сабой стрэсавую сітуацыю для таго, хто яго здае. Падрыхтоўка да яго суправаджаецца высокімі эмацыянальнымі, інтэлектуальнымі і фізічнымі нагрузкамі.

Час падрыхтоўкі да экзаменаў трэба разумна размеркаваць. Не варта займацца шмат гадзін без перапынкаў. Лепш вучыць блокамі: засвоіў тэму, замацаваў яе і адпачыў. Потым коратка паўтарыў, што завучыў, і – за новую тэму.

Адзначце тэмы, якія вы ўжо прапрацавалі і ў якіх адчуваеце сябе ўпэўнена.

Сканцэнтруйце ўвагу на пытаннях, да якіх вы слаба падрыхтаваныя.

Выкарыстоўвайце час, адведзены на падрыхтоўку, як мага больш эфектыўна. Новы і складаны матэрыял вучыце ў той час сутак, калі добра «думаецца», г.зн. адзначаецца высокая разумовая працаздольнасць. Звычайна гэта ранішнія гадзіны пасля добрага адпачынку.

Да матэрыялу, які цяжка запамінаецца, неабходна вяртацца некалькі разоў. Праглядаць яго на працягу некалькіх хвілін увечары, а затым яшчэ раз раніцай.

Каб лепш запомніць матэрыял, неабходна максімальна выкарыстоўваць усе магчымасці: успрымаць тэкст і на слых, і візуальна чытаць з ліста.

Трэніруйцеся адказваць на пытанні. Па меры таго, як вы вывучылі кожную тэму, спрабуйце адказваць на пытанні. Адказваючы на іх, вы набываеце ўпэўненасць у сабе і зможаце адказаць на нечаканыя пытанні на экзамене.

Пераказ тэксту сваімі словамі прыводзіць да лепшага запамінання, паколькі гэта актыўная, арганізаваная разумовая праца.

Вельмі карысна складаць схемы і алгарытмы канкрэтных тэм і трымаць іх у памяці, а не «зазубрываць» усю тэму цалкам “ад” і “да”.

Да экзамену лепш рыхтавацца з бацькамі, сябрам або сяброўкай: паўтараць, задаваць пытанні і адказваць на іх, «прамаўляць» увесь матэрыял.

За некалькі дзён да экзамену “прагані” ў думках магчымыя сітуацыі на іспытах, уяві сабе ва ўсіх дэталях абставіны будучага экзамену.

### *Парады выпускнікам па падрыхтоўцы да выпускнога экзамену па беларускай мове*

Экзамен - гэта заўсёды выпрабаванне, якому павінна папярэднічаць сур'ёзная, грунтоўная падрыхтоўка.

Па беларускай мове за курс базавай школы вучні здаюць пераказ тэксту. Падрыхтоўка павінна пачынацца загадзя, бо трэба не толькі паўтарыць правілы арфаграфіі і пунктуацыі, але і навучыцца працаваць з тэкстамі.

Большасць вучняў памылкова лічыць, што галоўнае - перадаць тэкст як мага бліжэй да арыгіналу. Між тым зусім не трэба імкнуцца пераказаць тэкст "слова ў слова", важна "выявіць галоўную думку (ідэю) твора ці ўрыўка, раскрыць яе праз перадачу зместу ў пэўнай паслядоўнасці , захоўваючы моўныя і стылёвыя сродкі ў адпаведнасці з ідэйна-мастацкай задачай зместу". Такі падыход дазваляе вучням выявіць свае творчыя магчымасці, а галоўнае - пазбегнуць цяжкасцей у напісанні. Так, амаль заўсёды можна замяніць сінонімам ці блізказначным слова, у напісанні якога вы сумняваецеся. Можна нават прапусціць слова, словазлучэнне, пэўную сінтаксічную канструкцыю, калі не памятаеце дакладна, як афармляць яе на пісьме (зразумела, такі пропуск магчымы толькі тады, калі ён не разбурае сказ, не робіць выказванне незразумелым). Можна змяніць парадак слоў у сказе, "падагнаць" яго пад правіла, якое вы ведаеце дакладна. Нарэшце, можна перабудаваць сказ (напрыклад, складаны бяззлучнікавы ў складаназлучаны ці складаназалежны, простую мову замяніць ускоснай, з аднаго складанага сказа зрабіць некалькі простых і г.д.). Словам, галоўная задача - знайсці аптымальны варыянт перадачы зместу тэксту і лепшага яго афармлення. Гэта задача пад сілу падрыхтаваным да такога віду творчай працы, як пераказ.

Задача вучняў - прааналізаваць тэарэтычны матэрыял. разабрацца ў ім, зразумець, што трэба завучваць (напісанні, правілы пастаноўкі знакаў прыпынку, асаблівасці беларускага сінтаксісу), а што - асэнсаваць.

Падрыхтоўка да экзамену ў форме пераказу мае сваю спецыфіку. Такі від работы, як дыктант, патрабуе пэўнага ўзроўню развіцця слыхавай (маторнай) памяці; рыхтуючыся да тэсту. неабходна развіваць найперш памяць зрокавую. Якаснае напісанне пераказу патрабуе даволі высокага развіцця абодвух відаў памяці. Таму заданні, змешчаныя ў дапаможніку, арыентаваны на развіццё і слыхавай, і зрокавай памяці.

Разам з тым многія практыкаванні арыентаваны на развіццё і ўдасканаленне камунікатыўных навыкаў (уменняў дакладна ўжываць словы, захоўваць іх лексічную спалучальнасць, будаваць словазлучэнні і сказы, пераказваць тэкст з захаваннем пэўных стылёвых асаблівасцяў).

Абавязкова выконвайце ўсе практыкаванні - гэта дапаможа вам замацаваць веды па тэорыі, выпрацаваць уменне карыстацца правіламі на практыцы.

Бясспрэчна, лепш рыхтавацца да экзамену пад кіраўніцтвам спецыяліста - настаўніка, выкладчыка падрыхтоўчых курсаў, рэпетытара. Але, калі гэта немагчыма, не трэба адчайвацца: дапаможнік якраз разлічаны на самастойную працу

абітурыентаў, у ім ёсць раздзел "Адказы да практыкаванняў",якi дапаможа вам праверыць сябе.

Усе пытанні, якія ўзнікаюць пры працы з тэарэтычным матэрыялам, практыкаваннямі, тэкстамі, абавязкова трэба занатаваць (можна адвесці для гэтага некалькі старонак у рабочым сшытку), каб потым задаць іх на кансультацыі, якая звычайна праводзіцца напярэдадні экзамену.

Неабходна нагадаць правілы напісання **пераказу.**

•Пры першым чытанні слухайце тэкст уважліва. Звярніце ўвагу, які тып маўлення ўласцівы яму, асаблівасці якога стылю мовы вам неабходна перадаць. Сфармулюйце для сябе тэму і галоўную думку тэкста (пра што вам трэба расказаць, што апісаць, над чым паразважаць і да якога вываду прыйсці).

•Калі тэкст чытаецца другі раз, вы можаце рабіць якія-небудзь паметкі: апорныя словы і спалучэнні слоў, змест простай мовы і інш. Пры неабходнасці экзаменатар звычайна тлумачыць некаторыя словы і выразы або нават запісвае іх на дошцы (як правіла, гэта словы іншамоўнага паходжання, якія рэдка ўжываюцца, або словы з лексікі абмежаванага ўжытку: прафесіяналізмы, дыялектызмы, устарэлыя словы).

•Цяпер вам трэба пераказаць тэкст. Спачатку пішыце так, як вам запомнілася. Затым загляніце ў запісы, зробленыя падчас другога чытання, і ўнясіце патрэбныя змяненні, дапаўненні.

Прачытайце, што ў вас атрымалася; пры гэтым сачыце за тым, каб выказванне вызначалася паслядоўнасцю, лагічнасцю, каб не было сказаў, сэнс якіх цяжка або ўвогуле нельга зразумець (няправільна пабудаваны сказ, прапушчана слова, няўдалы парадак слоў і г.д.). Калі трэба, перабудоўвайце сказы, замяняйце ці перастаўце словы.

•Прачытайце тэкст яшчэ раз, звяртаючы ўвагу на тое, ці ўдала вы падзялілі яго на абзацы. Пры наступным чытанні праверце напісанне слоў і пастаноўку знакаў прыпынку. Важна асэнсаваць, для чаго патрэбны той ці іншы знак прыпынку (што ён раздзяляе ці выдзяляе) і які знак павінен стаяць у кожным канкрэтным выпадку (калі вы не ўпэўнены, лепш перабудаваць сказ такім чынам, каб знак прыпынку не выклікаў у вас пытанняў).

•Некалькі хвілін адпачніце, а потым перапісвайце работу на чыставік. Старайцеся не рабіць выпраўленняў і пісаць разборліва, думайце над кожным пераносам.

•Перачытайце тэкст яшчэ раз. Зверце чыставік з чарнавіком (ці не прапусцілі якое-небудзь слова, знак прыпынку, ці не забыліся выдзеліць абзац). Калі дазваляе час, крыху адпачніце і потым яшчэ раз прачытайце сваю работу так, як чыталі чарнавік.

Як відаць, самаправерка пісьмовай работы - справа складаная і не менш адказная, чым напісанне самой работы.

Для паспяховага выканання работы вучні павінны ведаць:

- ♦ правапіс галосных;
- ♦ правапіс *й, ы* пасля прыставак;
- ♦ прыстаўныя гукі;
- ♦ правапіс *у-ў,*
- ♦ правапіс мяккага знака і апострафа;
- ♦ правапіс спалучэнняў зычных;

- правапіс вялікай літары;
- напісанне слоў асобна, разам, праз злучок;
- правапіс канчаткаў назоўнікаў;
- ужыванне роду і ліку назоўнікаў;
- ужыванне часоў дзеясловаў;
- правапіс лічэбнікаў;
- ужыванне і правапіс займеннікаў;
- правапіс прыслоўяў;
- ужыванне і правапіс дзеепрыметнікаў;
- ужыванне і правапіс дзеепрыслоўяў;
- ужыванне і правапіс *не(ня), ні* з рознымі часцінамі мовы;
- адасабленне даданых членаў сказа;
- пабочныя і ўстаўныя словы, зваротак;
- параўнальны зварот;
- просты і складаны сказ;
- віды складаных сказаў, знакі прыпынку ў іх;
- аднародныя члены сказа;
- спосабы перадачы чужой мовы.

У тэсце правяраюцца наступныя ўменні:

- уменне знаходзіць у слове арфаграмы;
- уменне вызначаць прамое і пераноснае значэнне слоў;
- уменне правільна ставіць націск;
- уменне вызначаць у сказе сэнсавыя часткі, якія патрабуюць выдзялення знакамі прыпынку;
- уменне бачыць парушэнні лексічных, граматычных, сінтаксічных нормаў;
- уменне вызначаць стылістычную прыналежнасць тэксту па пэўных моўных паказчыках;
- уменне аналізаваць і выкарыстоўваць адпаведныя сэнсавым адносінам сродкі сувязі сказаў у тэксце;
- уменне бачыць стылістычныя асаблівасці і выяўленча-вобразныя сродкі тэксту.